УДК 94(476)

**А. Г. Чарняўскі**
Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы

# РОЛЯ АДУКАЦЫІ Ў КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ МЕНШАСЦІ Ў ЛАТВІІ (1918–1940 ГГ.)

У дадзеным артыкуле, заснаваным на працах беларускіх і замежных даследчыкаў, архіўных і апублікаваных крыніцах на беларускай, латышскай і іншых мовах, характарызуюцца галоўныя напрамкі і тэндэнцыі развіцця сістэмы адукацыі беларускай меншасці ў Латвіі ў міжваенны перыяд (1918–1940 гг.). Аўтар акрэслівае заканадаўчую базу, на якую абапіралася беларускае школьніцтва, асноўныя перыяды яго развіцця, вызначае галоўныя арганізацыі і ўстановы, якія каардынавалі дзейнасць сістэмы асветы на беларускай мове ў гэтай краіне. У артыкуле вызначаюцца асноўныя тыпы навучальных устаноў, дынаміка іх колькасці, прыведзены асаблівасці дзейнасці найважнейшых устаноў. Таксама аўтар прасачыў уплыў «Беларускага працэсу» 1925 г. ці перавароту К. Улманіса 1934 г. на стан сістэмы беларускай асветы ў Латвіі.

У заключэнні аўтар робіць выснову, што беларусы ў Латвіі ў 1918–1940 гг. здолелі стварыць шматкампанентную сістэму беларускіх навучальных устаноў. Мэтамі гэтых навучальных устаноў былі ўзмацненне беларускай нацыянальнай свядомасці, падрыхтоўка кадраў для культурных і палітычных ініцыятыў беларускай меншасці ў Латвіі.

**Ключавыя словы:** Латвія, Даўгаўпілс, Рыга, беларуская меншасць, гімназія, адукацыя, міжваенны перыяд, таварыства «Бацькаўшчына».

**Для цытавання:** Чарняўскі А. Г. Роля адукацыі ў культурна-асветніцкай дзейнасці беларускай нацыянальнай меншасці ў Латвіі (1918–1940) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2023. № 1. С. 66–72. DOI: 10.52065/2520-6885-2023-269-1-12.

**A. Charniauski**
Yanka Kupala Grodno State University

# THE ROLE OF EDUCATION IN THE CULTURAL AND EDUCATIONAL ACTIVITIES OF THE BELARUSIAN NATIONAL MINORITY IN LATVIA (1918–1940)

This article, based on the works of Belarusian and foreign researchers, archival and published sources in Belarusian, Latvian and other languages, characterizes the main directions and trends of educational activities of the Belarusian minority in Latvia in the interwar period (1918–1940). The author defines the legislative base of Belarusian schooling, the main periods of Belarusian schooling development, the main organizations and institutions that coordinated the activities of the education system in the Belarusian language in this country, defines the main types of educational institutions, their dynamics. The author also outlines the influence of the «Belarusian Process» of 1925 or the K. Ulmanis coup of 1934 on the shape of the Belarusian education system in Latvia.

In the conclusion, the author concludes that Belarusians in Latvia in 1918–1940. managed to create a multi-component system of Belarusian educational institutions. The goals of these educational institutions were to strengthen Belarusian national consciousness, to train workers for cultural and political initiatives of the Belarusian minority in Latvia.

**Keywords:** Latvia, Daugavpils, Riga, Belarusian minority, gymnasium, education, interwar period, Society «Bats'kaushchyna».

**For citation:** Charniauski A. The role of education in the cultural and educational activities of the Belarusian national minority in Latvia (1918–1940). *Proceedings of BSTU, issue 6, History, philosophy.* 2023, no. 1 (269), pp. 66–72 (In Belarusian). DOI: 10.52065/2520-6885-2023-269-1-12.

**Уводзіны.** Латвія ў міжваенны перыяд з'яўлялася адным з найважнейшых цэнтраў беларускага нацыянальнага руху. Беларускія актывісты стварылі ў гэтай краіне шэраг культурніцкіх і палітычных арганізацый. У цэнтры ўвагі дзеячаў было распрацоўка шматузроўневай сістэмы асветніцкіх устаноў з беларускай мовай навучання, у чым яны дасягнулі найбольшага поспеху. Розныя пытанні дадзенай праблематыкі вывучалі такія даследчыкі, як Э. Екабсонс [1], Е. Гжыбоўскі [2], Г. Ведзішчава [3], У. Ляхоўскі [4], В. Коваль [5] і інш. Аднак ў гістарыяграфіі праблема беларускай сістэмы асветы ў Латвіі вывучаецца часцей не цэласна, а

разам з іншымі аспектамі гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў Латвіі.

**Асноўная частка.** 8 снежня 1919 г. Народная Рада Латвіі прыняла законы, якія акрэслівалі агульныя прынцыпы дзейнасці адукацыйных устаноў у рэспубліцы, і ў тым ліку мажлівасці нацыянальных меншасцей па адкрыцці сваіх школ. Паводле іх зместу, дзяржаўным установам і самаўрадам даручалася адкрыццё адпаведнай колькасці прадстаўнікоў нацыянальнай меншасці школьнай сістэмы; у тых мясцовасцях, дзе прадстаўнікоў меншасцей было няшмат, дазвалялася адкрыццё асобных класаў на роднай мове. Доля грашовых сродкаў, якія накіроўваліся на ўтрыманне школ, мусіла адпавядаць адсотку нацыянальнай меншасці ў складзе насельніцтва. Дазвалялася і стварэнне прыватных меншасцёвых навучальных устаноў [6; 7].

Свае школы з'явіліся і ў беларускай меншасці ў Латвіі, колькасць якой, паводле вынікаў перапісу 1920 г., складала 71 630 чалавек [8, с. 212]. У першай палове 1920-х гг. вялікую ролю ў стварэнні сістэмы беларускіх адукацыйных устаноў у Латвіі адыгрывала Беларускае культурна-асветніцкае таварыства «Бацькаўшчына». К. Езавітаў, заснавальнік і адзін з кіраўнікоў арганізацыі, пішучы пра дзейнасць Беларускага аддзела Міністэрства адукацыі, адзначаў: «...[Беларускі аддзел] *працаваў у поўным кантакце з гэтым Таварыствам* ["Бацькаўшчына"], *падтрымоўваў усе пачынаньні яго і сам абапіраўся на грамадзкую падтрымку Т-ва "Бацькаўшчына"*» [9, с. 71].

Рыхтуючыся да з'яўлення першых беларускіх школ, «Бацькаўшчына» пачала шукаць для іх настаўнікаў. Таварыства рэгістравала настаўнікаў-беларусаў, якія скончылі вучыцельскія семінарыі, восьмыя класы жаночых гімназій або здалі ў Расійскай імперыі ці Латвійскай рэспубліцы адпаведныя іспыты і мелі права выкладаць у школе. К. Езавітаў адзначаў, што такіх настаўнікаў знайшлося шмат і ў Дзвінску, і ў іншых частках Латгаліі [10, с. 97–98].

Каб падрыхтаваць зарэгістраваных асобаў да працы, умацаваць іх нацыянальную свядомасць, «Бацькаўшчына» арганізавала ў Дзвінску (Даўгаўпілсе) для іх адмысловыя курсы беларусазнаўства. Праца курсаў распачалася 28 ліпеня 1921 г., яны працягваліся шэсць тыдняў, а выкладалі там К. Езавітаў і запрошаны з Вільні І. Дварчанін. Беларусазнаўчыя курсы атрымалі фінансавую дапамогу ад школьнага дэпартамента Міністэрства асветы. Навучальная праграма курсаў складалася з заняткаў па гісторыі і геаграфіі Беларусі, беларускай мове і літаратуры і інш. Курсы паспяхова скончылі толькі 20 слухачоў з 73 [10, с. 97–98].

Таварыства «Бацькаўшчына» імкнулася арганізаваць такія самыя курсы і ў Люцынскім (Лудзаўскім) павеце, аднак тут, як адзначаў К. Езавітаў, «захады (…) па невядомых для нас прычынах ня былі прыняты пад увагу». Таму І. Дварчанін і К. Езавітаў правялі ў Люцыне некалькі лекцый пра беларускі нацыянальны рух для будучых настаўнікаў. К. Езавітаў адзначаў адмоўны ўплыў адсутнасці курсаў у Люцынскім павеце на стан беларускага руху і мясцовых беларускіх школ [10, с. 98].

Дзякуючы намаганням дзеячаў таварыства «Бацькаўшчына» восенню 1921 г. пачалі працу першыя 16 беларускіх школ. Яны адкрыліся ва ўсходніх валасцях Дзвінскага павета – Пустынскай і Прыдруйскай, якія мелі самы значны адсотак беларусаў у этнічным складзе насельніцтва [10, с. 98].

1 кастрычніка 1921 г. пачаў працу Беларускі аддзел Міністэрства адукацыі Латвіі (далей – Беларускі аддзел). Яго функцыямі былі стварэнне новых школ, утрыманне і кантроль за працай школ, падрыхтоўка настаўнікаў, пераклад падручнікаў і распрацоўка школьных праграм, фінансавая падтрымка культурніцкіх ініцыятыў [3, с. 91–94]. Акрамя гэтага, кіраўнік аддзела прадстаўляў перад дзяржаўнымі ўстановамі культурныя патрэбы сваёй нацыянальнай меншасці [7]. Беларускія актывісты дамагаліся з'яўлення свайго аддзела з мая 1921 г. Яны звярталіся ў Міністэрства адукацыі і шукалі дэпутата Саэймы (парламента), які б пагадзіўся стаць пасярэднікам, бо юрыдычна толькі дэпутат парламента мог накіраваць просьбу аб адкрыцці аддзела ў Міністэрства асветы [10, с. 99]. Дапамагчы згадзіўся Яніс Райніс, вядомы латышскі паэт [9, с. 62–63]. У выніку створаны Беларускі аддзел 18 кастрычніка ўзначаліў С. Сахараў [11].

На працягу 1921/1922 навучальнага года колькасць беларускіх школ паступова павялічвалася. Дзякуючы стварэнню новых навучальных устаноў і перадачы Беларускаму аддзелу некаторых рускіх школ, іх лік да канца навучальнага года дасягнуў 46 (каля 3500 вучняў) [8, с. 215].

Варта адзначыць, што беларускія школы ў Латвіі з'явіліся запозненa ў параўнанні са школамі іншых меншасцей. Яшчэ з восені 1918 г. тут працавалі літоўскія і польскія школы, дзейнічалі і нямецкія навучальныя ўстановы. Іншыя меншасці ў параўнанні з беларусамі раней пачалі адкрываць гімназіі. Гэта было звязана з тым, што воласці, у якіх жыла большасць беларусаў, былі замацаваныя за Латвіяй толькі ў 1920 г. у выніку падпісання мірнай дамовы з Савецкай Расіяй [12]. Хоць у 1921/1922 навучальным годзе беларусы мелі больш школ, чым палякі, у польскіх школах навучаліся 5456 вучняў (супраць прыблізна 3500 у беларускіх) [8, с. 215].

Функцыю падрыхтоўкі педагагічных фактараў выконвалі Беларускія дзяржаўныя аднагадовыя настаўніцкія курсы. Яны былі закладзеныя 1 снежня 1922 г. К. Езавітавым у Дзвінску

[10, с. 101]. Слухачы у 1923/1924 навучальным годзе вывучалі гісторыю і геаграфію Латвіі і Беларусі, латышскую і беларускую мовы, псіхалогію, філасофію, методыку выкладання і інш. [3, с. 165].

Першай беларускай сярэдняй установай у Латвіі лічыцца Люцынская беларуская гімназія. Яна была заснаваная па ініцыятыве таварыства «Бацькаўшчына». Першапачаткава яна была прыватнай прагімназіяй з 6-гадовым тэрмінам навучання. У ліпені 1923 г. Беларускі аддзел звярнуўся да міністра адукацыі з хадайніцтвам аб яе пераўтварэнні ў паўнавартасную гімназію. Працэс рэарганізацыі ў красавіку 1923 г. быў даручаны К. Езавітаву [4, с. 361]. Пад яго кіраўніцтвам гімназія стала дзяржаўнай і пачала цалкам фінансавацца ўрадам [10, с. 102]. Школа мела драматычны гурток, хор, тут выдаваўся вучнёўскі часопіс «Ластаўка» [1, с. 61; 9, с. 103], дзейнічала скаўцкая дружына [4, с. 366].

Самай значнай і вядомай беларускай сярэдняй навучальнай установай ў міжваеннай Латвіі была Дзвінская беларуская гімназія. Падрыхтоўку да яе адкрыцця першапачаткова ўзначаліў К. Езавітаў. Таварыства «Бацькаўшчына» сабрала подпісы бацькоў, адшукала для гімназіі будынак у Дзвінску па адрасе вул. Варшаўская, 16. Ініцыятыву падтрымалі дзяржаўныя ўлады: 1 красавіка 1922 г. І. Краскоўскі атрымаў прызначэнне на пасаду дырэктара гімназіі [10, с. 101]. А ў красавіку 1925 г. выканаўцам абавязкаў дырэктара быў С. Сахараў (афіцыйна дырэктарам ён стаў 1 жніўня 1925 г.) [13, 14].

Заняткі ў Дзвінскай беларускай гімназіі пачаліся восенню 1922 г. Гэтая навучальная ўстанова была гуманітарнага тыпу [15, с. 131], але заняткі праводзіліся і па дакладных дысцыплінах [16]. Школа мела свае інтэрнат на 45 вучняў [4, с. 365], бібліятэку, фізічны і хімічны кабінеты, сад, слясарную і ткацкую майстэрні. Істотная ўвага надавалася і мастацкаму выхаванню навучэнцаў: гімназія мела ўласную залу са сцэнай, на якой выступалі сябры драматычнага, балетнага гурткоў, хору і аркестра [10, с. 101; 17, с. 121–124]. У гімназіі сфармаваўся свой скаўцкі атрад [18]. Установа стала адным з цэнтраў грамадскага жыцця беларусаў Латвіі: напрыклад, у яе памяшканнях ў жніўні 1923 г. адбылася Беларуская настаўніцкая канферэнцыя [19].

Таксама ў Дзвінску ў 1922–1924 гг. дзейнічала прыватная беларуская сельскагаспадарчая двухгадовая школа таварыства «Бацькаўшчына» [1, с. 63; 9, с. 69]. Часткова школу фінансавала Міністэрства земляробства – яно выдаткоўвала грошы на настаўніка-агранома і навучальны інвентар. У гэтай навучальнай установе беларускую мову і гісторыю Беларусі выкладала П. Мядзёлка-Грыб, якая таксама была і кіраўніком тэатральна-музычнай дзейнасці навучэнцаў [10, с. 102; 15, с. 132].

Беларусы, якія мелі сярэднюю адукацыю, але не валодалі латышскай мовай і не мелі уласных сродкаў для навучання ў вышэйшых навучальных установах за мяжой, атрымалі магчымасць патрапіць на навучанне ў Чэхаславакію – гэта было плёнам кантактаў таварыства «Бацькаўшчына» з беларускай дыяспарай у гэтай краіне [4, с. 365]. Навучанне ў беларускіх гімназіях, дзе латышская мова з’яўлялася абавязковым прадметам, давала вучням мажлівасць паступіць у вышэйшыя навучальныя ўстановы Латвіі [10, с. 102; 20]. Але беднасць і ім перашкаджала атрымаць вышэйшую адукацыю. У 1925 г. газета «Голас беларуса» так ахарактарызавала становішча беларусаў – студэнтаў Люцынскай гімназіі: «*Сродкаў у іх, як і наагул у беларусаў, – няма. Варункі вучэньня будуць цяжкія. Але моладзь мае надзею, што "як-колечы выкруціцца"*» [20].

На працягу 1921/1922 і 1922/1923 навучальных гадоў колькасць беларускіх школ паступова расла. У 1923 г. першая беларуская школа з’явілася ў Рызе [3, с. 164]. Але падчас 1923/1924 навучальнага года назіралася адваротная тэндэнцыя: колькасць школ зменшылася з 50 да 36. Гэтае змяншэнне было выкліканае рашэннем улад ператварыць школы, у якіх колькасць беларусаў сярод вучняў складала менш за 60%, у нацыянальна мяшаныя школы [3, с. 102]. Беларускія дзеячы бачылі ў гэтым працэсе спробу латышызацыі беларусаў. К. Езавітаў меркаваў, што гэтыя меры шкодзілі беларускім гімназіям (з-за меншай колькасці патэнцыяльных вучняў у іх) і адмоўна ўплывалі на беларускі рух у Латвіі [9, с. 93-96].

Тэндэнцыю на зніжэнне памераў беларускага школьніцтва замацавалі падзеі, звязаныя з «Беларускім працэсам» 1925 г. Першапачаткова ўлады бачылі ў беларусах супрацьвагу польскаму руху, дзеячы якога ўздымалі пытанне пра далучэнне часткі Ілукстанскага павета да Польшчы. У сярэдзіне 1920-х гг. стаўленне латвійскіх улад да беларускага руху змянілася: у дзеяннях беларусаў пачалі бачыць небяспеку для Латвійскай дзяржавы, што магло прывесці да вышэйзгаданага «Беларускага працэсу» [1, с. 49–53; 21, с. 39].

Так, у 1924 г. шэраг значных беларускіх дзеячаў былі арыштаваныя і абвінавачаныя ў сепаратызме [1, с. 53]. Арышты ўскладнілі працу школ: 13 чэрвеня 1924 г. не змаглі скончыцца выпускныя экзамены ў Дзвінскай беларускай гімназіі [22]. У рамках следства адбыліся вобыскі ў беларускіх гімназіях і некаторых іншых школах [23]. Спынілася дзейнасць таварыства «Бацькаўшчына». Аднак усе абвінавачаныя былі апраўданыя судом 4 красавіка 1925 г. [9, с. 111]. Тым не менш у выніку згаданых падзей былі ліквідаваныя Беларускі аддзел [24], Люцынская беларуская гімназія [25]; настаўнікі І. Краскоўскі, П. Мядзёлка-Грыб, якія не мелі латвійскага грамадзянства, пакінулі краіну [15, с. 133; 26].

Нягледзячы на гэта, пасля «Беларускага працэсу» становішча беларускай школьнай сістэмы паступова стабілізавалася. 28 ліпеня 1926 г. Урад прыняў рашэнне аднавіць Беларускі аддзел: яго часовым кіраўніком стаў Р. Плыгаўка, а з 18 студзеня 1927 г. афіцыйна пасада была даручаная У. Пігулеўскаму [3, с. 99; 27]. З'явіліся новыя арганізацыі асветніцкага напрамку, напрыклад Латвійскае таварыства беларускіх настаўнікаў [28]. Сваю гімназію ў 1929 г. атрымалі беларусы Рыгі [8, с. 216].

На развіццё беларускай сістэмы адукацыі паўплывалі вынікі перапісу насельніцтва 1925 г. Калі ў 1920 г. ў Латвіі было зафіксавана каля 71 630 беларусаў, то ў 1925 г. – толькі 38 010. У адпаведнасці з вынікамі перапісу фарміраваўся бюджэт меншасцёвых аддзелаў Міністэрства адукацыі, таму ў другой палове 1920-х гг. скарацілася дзяржаўнае фінансаванне беларускага школьніцтва [3, с. 98]. Агульная колькасць школ паступова зніжалася: у 1927 г. працавалі 36 пачатковых школ, а ў 1933 г. – 23 пачатковыя школы [8, с. 212, 215]. Знакавай падзеяй стала рашэнне аб закрыцці знакамітай Дзвінскай беларускай гімназіі, якое пачало выконвацца ў другой палове 1932 г. [29, с. 112].

Якасна новы этап у гісторыі беларускай асветы ў Латвіі пачаўся пасля ўсталявання аўтарытарнага рэжыму К. Улманіса ў маі 1934 г. Пасля майскага перавароту ўлады ўзялі курс на цэнтралізацыю кіравання сістэмай асветы нацыянальных меншасцей і паступовае яе згортванне. Так, у 1934 г. быў ліквідаваны Беларускі аддзел, а замест яго была створана рэферэнтура пад кіраўніцтвам П. Журкоўскага [3, с. 96; 30, с. 330]. Значна змяніліся ўмовы адкрыцця і дзейнасці школ меншасцей. Мінімальная колькасць вучняў, для якіх дазвалялася стварэнне нацыянальных школ, узрасла з 30 да 80. Калі адзін з бацькоў вучня быў латышом ці латышкай, вучань не мог наведваць меншасцёвую школу [3, с. 70].

Палякі, літоўцы, эстонцы ў новых умовах маглі разлічваць на дыпламатычную дапамогу сваіх нацыянальных дзяржаў. Напрыклад, Эстонія і Латвія 17 чэрвеня 1934 г. падпісалі канвенцыю, паводле якой абодва бакі гарантавалі спрыяльныя ўмовы для дзейнасці адпаведных меншасцёвых школ (усталявана мінімальная колькасць вучняў школ ў колькасці 15 чалавек) [31]. Аднак беларусы такой дыпламатычнай апекі не мелі. Улічваючы гэта, а таксама ранейшыя канфлікты беларускіх дзеячаў з польскімі, рускімі і латышскімі палітыкамі, тое, што ў дачыненні да беларусаў у мінулы перыяд узнікалі падазрэнні ў сепаратызме, слабую нацыянальную свядомасць беларусаў, – чакана, што колькасць беларускіх школ пачала змяншацца. Беларускія школы закрываліся ці пераўтвараліся ў нацыянальна-мяшаныя. Так, у 1935 г. у адну ўстанову былі аб'яднаныя класы беларускай, польскай і рускай гімназій Дзвінска. Урэшце, у 1939/1940 навучальным годзе ва ўсёй Латвіі заставалася адзіная беларуская школа ў Рызе [1, с. 70; 8, с. 214–220].

**Заключэнне.** Такім чынам, беларуская меншасць у міжваеннай Латвіі здолела стварыць шматкампанентную сістэму беларускіх навучальных устаноў. Мэтамі гэтых навучальных устаноў былі ўзмацненне беларускай нацыянальнай свядомасці, падрыхтоўка кадраў для культурных і палітычных ініцыятыў беларускай меншасці ў Латвіі. Першыя беларускія школы з'явіліся ў 1921 г. Гэта адбылося дзякуючы дзеячам таварыства «Бацькаўшчына», якое ў першай палове 1920-х гг. адыгрывала галоўную ролю ў развіцці беларускага школьніцтва. Разгортванню сістэмы беларускіх школ спрыяла ліберальнае заканадаўства Латвійскай рэспублікі аб асветніцкіх установах нацыянальных меншасцей, прыхільнае стаўленне дзяржаўных улад да беларусаў, у якіх бачылі супрацьвагу іншым нацыянальным меншасцям. Ускладнялі развіццё беларускага школьніцтва недахоп фінансавання, разнагалоссі між беларускімі дзеячамі, канфлікты беларусаў з польскімі, рускімі, латышскімі дзеячамі.

Установай, якая каардынавала працу беларускіх школ, быў Беларускі аддзел Міністэрства адукацыі Латвіі. Беларускі аддзел, як і першыя беларускія школы, з'явіўся запознена ў параўнанні з іншымі аддзеламі буйных нацыянальных меншасцей Латвіі – немцамі, рускімі, яўрэямі, палякамі. Гэта звязана з тым, што пераважная большасць воласцей са значным адсоткам беларусаў юрыдычна былі замацаваныя за Латвіяй толькі ў жніўні 1920 г.

Найбольшага маштабу беларускае школьніцтва дасягнула на пачатку 1923/1924 навучальнага года. Напярэдадні «Беларускага працэсу» 1925 г. з'явілася тэндэнцыя да памяншэння колькасці школ, якая працягнулася і пасля працэсу. Пасля перавароту К. Улманіса 1934 г. сістэма беларускіх школ амаль спыніла сваё існаванне – да лета 1940 г. засталася толькі адна школа.

Большасць навучальных устаноў, створаных беларусамі ў міжваеннай Латвіі, – пачатковыя школы. Іх выпускнікі маглі працягваць навучанне ў трох гімназіях (у Люцыне, Дзвінску і Рызе). Сярод беларускіх школ былі як дзяржаўныя, так і прыватныя навучальныя ўстановы. Пачынаючы з 1921 г. дзеячамі беларускага руху таксама была наладжаная падрыхтоўка педагагічных кадраў для беларускіх асветніцкіх ініцыятыў. Асобным накірункам асветніцкай дзейнасці беларускай меншасці была арганізацыя прафесійнага сельскагаспадарчага навучання.

## Спіс літаратуры

1. Екабсонс Э. Белорусы в Латвии в 1918–1940 годах // Беларуская дыяспара як пасрэдніца ў дыялогу цывілізацый. Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. С. 47–71.

2. Гжыбоўскі Е. Савецкая рэчаіснасць на бачынах беларускай газеты ў Латвіі «Голас беларуса» (1925–1929 гг.) // "Światła masz tyle w sobie…". Ze studiów wschodniosłowiańskich. Lublin: Wydawnictwo KUL, 2015. S. 207–222.

3. Vediščeva J. Mazākumtautību pamatizglītība Latvijā (1918-1940). Promocijas darbs pedagoģijas doktora zinātniskā grāda iegūšanai. Rīga: Latvijas universitāte, 2010. 218 lpp.

4. Ляхоўскі У. Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.). Смаленск: Інбелкульт, 2015. 480 с.

5. Коваль В. У. Музычнае і тэатральнае мастацтва беларускай дыяспары (1918–1939) // Труды БГТУ. 2016. № 5. С. 32–36.

6. Latvijas Tautas Padomē pieņemtie likumi // Valdības Vēstnesis. 1919. Nr. 88. 17 decembrī. Lpp. 1–2.

7. Latvijas Tautas Padomē pieņemtie likumi // Valdības Vēstnesis. 1919. Nr. 89. 18 decembrī. Lpp. 1.

8. Jēkabsons Ē. Polskie, białoruskie i litewskie szkolnictwo na Łotwie w okresie międzywojennym // Rola oświaty i szkolnictwa w procesie kształtowania się świadomości narodowej na pograniczu polsko-litewsko-białoruskim. Białystok: Prymat, 2007. S. 211–220.

9. Езавітаў К. Беларусы ў Латвіі // Запісы Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва. № 36. Нью-Ёрк – Менск: Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва, 2013. С. 9-129.

10. Езавітаў К. Беларускае культурна-асьветнае таварыства «Бацькаўшчына» ў Латвіі // Крыніца. 1997. № 7. С. 95–104.

11. Valdības darbība. Minisru kabineta sēde 1921. g. 18. oktobrī // Valdības Vēstnesis. 1921. Nr. 237. Lpp. 3.

12. Кастусёнак. Беларусы ў Латвіі // Сын Беларуса. 1924. № 7. С. 2.

13. Iecelšanas // Valdības Vēstnesis. 1925. Nr. 153. Lpp. 2.

14. Pēdējas ziņas. Iecelšanas // Daugavas Vēstnesis. 1925. Nr. 16–17. Lpp. 5.

15. Екабсонс Э. Политика Латвийского государства в отношении белорусов // Латвия – Беларусь: 1918–2018 / редкол. М. Королёв (гл. ред.) [и др.]. Минск: Четыре четверти, 2018. С. 122–143.

16. Baltkrievu pamatskolu stundu plani 1925./1926. māc. gadam // Valdības Vēstnesis. 1925. Nr. 183. Lpp. 2.

17. Сахарава В., Сахараў С. Выбраныя творы / уклад., камент. М. Казлоўскага, С. Панізьніка; прадм. М. Казлоўскага. Мінск: Кнігазбор, 2015. 560 с.

18. Беларусы ў Латвіі // Новае жыццё. 1923. № 11. С. 4.

19. Бѣлорусскій учительскій конгрессъ // Сегодня. 1923. № 175. С. 4.

20. Беларускае жыццё // Голас беларуса. 1925. 10 ліпеня. С. 3.

21. Grzybowski J. Stosunki polsko-białoruskie na Łotwie w latach 1920–1940 // Dzieje kultur czy zarzewie konfliktów? Problematyka mniejszości narodowych i etnicznych w Europie / pod redakcją T. Gajownika [i innych]. Olsztyn: Wydawnictwo UWM, 2017. S. 33–48.

22. Арышты беларусаў у Латвіі // Сын беларуса. 1924. № 6. С. 4.

23. Беларускі дзяржаўным архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ). Ф. 3. Воп. 1. Спр. 256. Л. 39.

24. Iekšzeme // Daugavas Vēstnesis. 1925. № 1. Lpp. 2.

25. Lēmums Nr. A-913 1925. g. 10. julijā // Valdības Vēstnesis. 1925. Nr. 50. Lpp. 1.

26. БДАМЛМ. Ф. 403. Воп. 1. Спр. 43. Л. 4.

27. Беларускі аддзел узнавіў сваю працу // Покліч. 1926. № 3. С. 30–31.

28. Rīgas apgabalt. reģistrac. nodaļa… // Valdības Vestnesis. 1925. Nr. 219. Lpp. 5.

29. Крывіцкія руны. Вып. III: Беларускі культурны мацярык у Латвіі / уклад., прадм., камент. М. Казлоўскага, С. Панізьніка. Мінск: Кнігазбор, 2019. 284 с.

30. Крывіцкія руны. Вып. II: Беларускі культурны мацярык у Латвіі / уклад., прадм., камент. М. Казлоўскага, С. Панізьніка. Мінск: Кнігазбор, 2017. 452 с.

31. Likums par Skolu konvenciju starp Latviju un Igauniju // Valdības Vēstnesis. 1934. Nr. 132. Lpp. 1–2.

## References

1. Yekabsons E. Belarusians in Latvia in 1918–1940. *Belaruskaya dyyaspara yak pasrednitsa u dyyalogu tsyvilizatsyy* [The Belarusian diaspora as an intermediary in the dialogue of civilizations]. Minsk, Bielaruski knihazbor Publ., 2001, pp. 47–71 (In Russian).

2. Grzybowski J. Soviet reality on the pages of the Belarusian newspaper in Latvia "Voice of the Belarusian" (1925–1929). *"Światła masz tyle w sobie…". Ze studiów wschodniosłowiańskich* ["You have

so much light…”. From East Slavic studies]. Lublin, Wydawnictwo KUL Publ., 2015, pp. 207–222 (In Polish).

3. Vediščeva J. *Mazākumtautību pamatizglītība Latvijā (1918–1940). Promocijas darbs pedagoģijas doktora zinātniskā grāda iegūšanai* [Primary education of national minorities in Latvia (1918–1940). Doctoral thesis for obtaining the scientific degree of doctor of pedagogy]. Riga, 2010, 218 p. (In Latvian).

4. Lyakhouski U. *Ad gomanautsau da gaysakou. Chynnasts' belaruskikh maladzyovykh arganizatsyy u 2-y palove XIX st. — 1-y palove XX st. (da 1939 g.)* [From Homan to the Haisaks. Activities of Belarusian youth organizations in the 2nd half of the XIX century – 1st half of the XX century (until 1939)]. Smolensk, Inbelkul’t Publ., 2015. 480 p. (In Belarusian).

5. Koval V. U. Musical and theatrical art of the Belarusian diaspora (1918–1939). *Trudy BGTU* [Proceedings of BSTU], 2016, no. 5, pp. 32–36 (In Belarusian).

6. Laws adopted by the Council of the People of Latvia. *Valdības Vēstnesis* [Government Gazette], 1919, no. 88, pp. 1–2 (In Latvian).

7. Laws adopted by the Council of the People of Latvia. *Valdības Vēstnesis* [Government Gazette], 1919, no. 89, pp. 1 (In Latvian).

8. Jēkabsons Ē. Polish, Belarusian and Lithuanian education in Latvia in the interwar period. *Rola oświaty i szkolnictwa w procesie kształtowania się świadomości narodowej na pograniczu polsko-litewsko-białoruskim* [The role of education and schooling in the process of shaping national identification in the Polish-Lithuanian-Belarusian borderland]. Białystok, Prymat Publ., 2007, pp. 211–220 (In Polish).

9. Yezavitau K. Belarusians in Latvia. *Zapisy belaruskaga instytutu navuki y mastatstva. № 36* [Records of the Belarusian Institute of Science and Art. No. 36]. New York, Minsk, Belaruski Instytut Navuki y Mastatstva Publ., 2013, pp. 9–129 (In Belarusian).

10. Yezavitau K. Belarusian cultural and educational society ‘Batskaushchyna’ in Latvia. *Krynica* [Source], 1997, no. 7, pp. 95–104 (In Belarusian).

11. Government Action. Cabinet meeting on October 18, 1921. *Valdības Vēstnesis* [Government Gazette], 1921, no. 237, p. 3 (In Latvian).

12. Kastusyonak. Belarusians in Latvia. *Syn Belarusa* [Son of a Belarusian], 1924, no. 7, p. 2 (In Belarusian).

13. Appointments. *Valdības Vēstnesis* [Government Gazette], 1925, no. 153, p. 2 (In Latvian).

14. Latest news. Appointments. *Daugavas Vēstnesis* [Daugava Gazette], 1925, no. 16–17, p. 5 (In Latvian).

15. Yekabsons E. The policy of the Latvian state towards Belarusians. *Latviya – Belarus’: 1918–2018* [Latvia – Belarus: 1918–2018]. Minsk, Chetyre chetverti Publ., 2018, pp. 122–143 (In Russian).

16. Lesson plans of Belarusian primary schools for the year 1925/1926. *Valdības Vēstnesis* [Government Gazette], 1925, no. 183, p. 2 (In Latvian).

17. Sacharava V., Sacharau S. *Vybranyua tvory* [Selected works]. Minsk, Knigazbor Publ., 2015. 560 p. (In Belarusian).

18. Belarusians in Latvia. *Novaye zhyts'tsyo* [New life], 1923, no. 11, p. 4 (In Belarusian).

19. Belarusian Teachers' Congress. *Segodnya* [Today], 1923, no. 175, p. 4 (In Russian).

20. Belarusian life. *Golas Belarusa* [Voice of a Belarusian], 1925, July 10, p. 3 (In Belarusian).

21. Grzybowski J. Polish-Belarusian relations in Latvia in 1920–1940. *Dzieje kultur czy zarzewie konfliktów? Problematyka mniejszości narodowych i etnicznych w Europie* [The history of cultures or the source of conflicts? The issues of national and ethnic minorities in Europe]. Olsztyn, Wydawnictwo UWM Publ., 2017, pp. 33–48 (In Polish).

22. Arrests of Belarusians in Latvia. *Syn Belarusa* [Son of a Belarusian], 1924, no. 6, p. 4 (In Belarusian).

23. Belarusian State Archive-Museum of Literature and Art. Fund. 3. L. 1. F. 256. P. 39.

24. Interior news. *Daugavas Vēstnesis* [Daugava Gazette], 1925, no. 1, p. 2 (In Latvian).

25. Decision no. A-913 of July 10, 1925. *Valdības Vēstnesis* [Government Gazette], 1925, no. 50, p. 1 (In Latvian).

26. Belarusian State Archive-Museum of Literature and Art. Fund. 403. L. 1. F. 43. P. 4.

27. The Belarusian department renewed its work. *Poklich* [Call], 1926, no. 3, pp. 30–31 (In Belarusian).

28. Registration Department of the Riga District Court. *Valdības Vēstnesis* [Government Gazette], 1925, no. 219, p. 5 (In Latvian).

29. *Kryvitskiya runy. Vyp. III: Belaruski kul’turny matsyaryk u Latvii* [Kryvičy’s runes. Issue III: Belarusian cultural heritage in Latvia]. Minsk, Knihazbor Publ., 2019, 284 p (In Belarusian).

30. *Kryvitskiya runy. Vyp. II: Belaruski kul'turny matsyaryk u Latvii* [Kryvičy's runes. Issue II: Belarusian cultural heritage in Latvia]. Minsk, Knihazbor Publ., 2017, 452 p (In Belarusian).

31. Law on the School Convention between Latvia and Estonia. *Valdības Vēstnesis* [Government Gazette], 1934, no. 132, pp. 1–2 (In Latvian).

### Інфармацыя пра аўтара

**Чарняўскі Аляксандр Генадзьевіч** – аспірант Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, Рэспубліка Беларусь); настаўнік гісторыі ДУА «Сярэдняя школа № 3 г. Скідзеля». E-mail: charniauski.alaksandr1999@gmail.com

### Information about the author

**Charniauski Aliaksandr Hienadzjevich** – PhD student, Yanka Kupala Grodno State University (22, Azheshka str., 230023, Hrodna, Belarus); history teacher at Skidziel School no. 3. E-mail: charniauski.alaksandr1999@gmail.com

*Паступіў 28.02.2023*